# МАСТАЦТВА КНІЖНАГА ЗНАКА

Каля трохсот мініяцюрных гравюр, літаграфій, афортаў і іншых відаў экслібрыса прадставілі на Усесаюзную выстаўку сучаснага савецкага кніжнага знака мастакі брацкіх рэспублік.

— Пасля першай такой выстаўкі мінула каля дваццаці гадоў, —сказаў карэспандэнту БЕЛТА старшыня секцыі экслібрыса праўлення добраахвотнага таварыства аматараў кнігі БССР М. І. Мінкевіч. — За гэты час колькасць паклоннікаў мастацтва кніжнага знака нязмерна ўзрасла.

Выстаўка разгорнута ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна.